

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Жыхара Баранавічаў асудзілі на два гады «хіміі» за сарваны з будынка дзяржаўны сцяг

У судзе Баранавічскага раёна і г. Баранавічы 25 кастрычніка вынеслі прысуд **Аляксандру Бакуновічу**, якога вінавацілі ў здзеку над дзяржаўнымі сімваламі (арт. 370 КК).

Згодна з абвінавачваннем, у ноч на 13 ліпеня 2021 года **Аляксандр Бакуновіч** *«наўмысна схапіў за дрэўка сцяг, які знаходзіўся ў кранштэйне на будынку ЖРЭУ, паламаў яго на дзве часткі, пасля панёс сцяг да дома №17 па вул. Наканечнікава і кінуў яго на зямлю»*. Нанесеная шкода ЖРЭУ ад учынку абвінавачанага склала 4 рублі 70 капеек (за зламанае дрэўка).

Аляксандр Бакуновіч прызнаў віну цалкам. Распавёў, што вечарам 12 ліпеня сустрэўся са знаёмымі, выпіваў піва, пасля ішлі каля будынка ЖРЭУ і абвінавачаны пабачыў флаг, вырашыў зняць і памахаць ім. Адзначыў, што не меў ніякага дрэннага намеру. Калі Аляксандр зняў сцяг, то пабачыў, што дрэўка зламалася, спужаўся адказнасці, таму скруціў палатно і панёс яго далей. Нанесеную шкоду сплаціў у памеры 27 рублёў, хаця сцяг быў вернуты.

Падчас спрэчак бакоў пракурор **Уладзімір Карачун** запрасіў пакаранне для абвінавачанага ў выглядзе двух гадоў «хіміі». Адвакатка казала, што заяўлены дзяржабвінавачваннем тэрмін вельмі суровы, прасіла вызваліць Бакуновіча ад крымінальнай адказнасці і прыцягнуць яго да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафа ў мінімальна магчымым памеры.

У выніку суддзя **Мікалай Кміта** пастанавіў прызнаць Бакуновіча вінаватым і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады
t.me/viasna96/7797
5.2K viewsedited Oct 27, 2021 at 08:50

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy